Шмат народаў жыве на
Зямлі,
Кожны з іх чымсьці адметны.
Але шчаслівы тыя з іх, што
змаглі
Зберагчы свой скарб
запаветны…

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа №30 г. Бабруйска”

Чарняўская Кацярына

даследчая работа

# “Лён сінявокі – скарб маёй краіны”

# З чаго ўсё пачыналася…







задавальненнем спяшаюся да сваёй бабулі ў горад Іўе, што на Гродзеншчыне. Так было і мінулым летам. Бабуля заўсёды ветліва сустракае мяне. Аднойчы яна паказала мне вышываныя ільняныя ручнікі і абрусы, якія засталіся ад яе матулі, маёй прабабулі. Яна распавядала мне, што ільняныя абрусы і ручнікі ў беларусаў перадаюцца звычайна з пакалення ў пакаленне, і што традыцыя беражлівых адносін да ільняных

вялікая рукадзельніца. Яна ўмее вязаць, рабіць прыгожыя кампазіцыі з паперы. Бабуля ведае шмат народных песень. Мне спадабалася і запомнілася песня “Ох, і сеяла Ульяніца











**На радзіме маёй настаўніцы, у горадзе Чавусы, ёсць гісторыка-краязнаўчы музей, у якім знаходзіцца партрэт жанчыны, якой прысвечана песня “Ох, і сеяла Ульяніца лянок”. Мяне зацікавіла гісторыя песні і, наогул, якое значэнне мае лён у жыцці беларусаў са**



**Мэта**: паказаць значэнне лёну ў жыцці чалавека.

**Задачы**:

1) вызначыць, якое месца займае лён у культуры і мастацтве Беларусі;

2) высветліць, як беларусы выкарыстоўваюць лён у жыцці;

3) выявіць карысныя ўласцівасці лёну;

4) даведацца, што

**Аб’ект:** лён.

**Прадмет:** лён у жыцці беларусаў.

**Гіпотэза:** дапусцім, што расліна лён сапраўды з’яўляецца скарбам нашай краіны.

**Метады:**

аналіз літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў;

анкетаванне;

параўнанне;

інтэрв’ю

Лён часта сустракаецца ў беларускім фальклоры, сімвалізуючы чыстыя думкі, дабрыню, працавітасць. Пра яго спявалі, складалі вершы, прыказкі, прымаўкі, загадкі і заклічкі. Народ прысвяціў вырошчванню льну шмат танцаў і карагодаў.

Пра лён, пра яго хараство, пра багацце, якое прыносіць ён чалавеку, складзена шмат песень.

- Пасееш лён — збярэш золата.
- Дзень падаўжэў — нітка пакарацела.
- Рана ўстала, ды мала напрала.
- Слуцкія ткачыхі могуць увесь свет спавіць.
- Якая папрадуха пры кудзелі, такое палатно ў белі.





## Янка Купала

…Ой, лянок, лянок мой
чысты,
Валакністы, залацісты!
Як расці стаў, як падрос,
Як лісткі ўзняў дагары,—
Лён палола з ранніх рос
Да вячэрняе зары.

## Рыгор Барадулін

…Сінеліся вачэй
ільны,
Звінелі слоў крыніцы.
Запас Мянескаў—
валуны
Пайшлі на камяніцы.





## Максім Танк

…Ткала я, ткала
палотны
Цэлыя ночы і дні,
Ткала ў роднай матулі
З лёну свае васмярні.

# Мікола Чарняўскі
## “Лён”

На сцяблінцы кожнай –
Сіненькі званочак:
Хораша на ранку
Лён расцвіў, ляночак.
Мама сцежкай крочыць.
Сонцам ззяюць вочы:
Добры ў нашай мамы
Вырас лён-ляночак.
Ветрык павявае,
Шэпчацца з ляночкам.
Мама нам ляночку
Падпляла ў вяночкі. –
Расцвітайце, дзеці,
Нібы лён-ляночак –
Будзе светла ў свеце
Ад блакітных вочак!





традыцыйнага беларускага ткацтва былі абавязковым атрыбутам у радзінных, вясельных і пахавальных абрадах. У вясельных абрадах жаніх і нявеста станавіліся ў час вянчання на ільняны ручнік. Маладым звязвалі рукі ручніком, што сімвалізавала адзінства. Каб нявеста хутка парадавала сям'ю нараджэннем здаровых дзяцей, ёй у косы ўплёталі валакно лёну. Чыстая і светлая ільняная адзежа была паказчыкам маральнай чысціні, таму маладая дзяўчына, выходзячы замуж, апранала сукенку, зробленую з












На беларускай зямлі лён вырошчваюць са старадаўніх часоў і да сённяшніх дзён. З валакна ткуць палатно і шыюць вопратку, вырабляюць прадметы побыту, майструюць цацкі для дзяцей. Семя ільну мае цэлы скарб карысных рэчываў, высокую харчовую каштоўнасць і багата лекавымі ўласцівасцямі.









У Беларусі апрацоўкай і вырошчваннем ільну займаюцца 160 льнасеючых арганізацый, функцыянуе 36 льнозаводаў.

Беларускія прадпрыемствы выпрацоўваюць наступную прадукцыю:

* сталовую бялізну – ільняныя абрусы і сурвэткі
ручнікі з лёну;
* пасцельную бялізну, у тым ліку камплекты для дзяцей
пледы і покрыўкі;
* касцюмную і сукеначную тканіну
мэблевую тканіну;
* тканіну прамыслова-тэхнічнага назначэння
палотны для жывапісу









мастацкія промыслы ажыццяўляюць вытворчасць тавараў народных рамёстваў, уключаючы вырабы знакамітых “Слуцкіх паясоў”. У далёкія часы для сялян “Слуцкія паясы” ткаліся з лёну.





У ходзе даследвання я даведалася, што ў нашым родным горадзе Бабруйску працуе “Фабрыка мастацкіх вырабаў ”. Мне са сваімі аднакласнікамі захацелася пабываць на фабрыцы і даведацца, што вырабляюць на прадпрыемстве ў цяперашні час.







Мы пабывалі на выставе ільняных вырабаў і з задавальненнем разглядвалі вырабленыя з ільну ручнікі, абрусы, пасцельную бялізну, сумкі, галаўныя ўборы. Нам нават пашчасціла прымерыць адзенне з ільняной тканіны.





Цікавасць да беларускай ільняной галіны дэманструе і рад замежных краін, такіх як Бельгія, Японія, Францыя. Цікава, што ў Бельгіі з беларускага лёну робяць валюту (еўра).



гасціннасцю і ветлівасцю. Ільняны абрус і ручнік сімвалізуюць гэтыя рысы. Славіцца Беларусь і сувенірнай прадукцыяй, выраблена з лёну (лялькі, абярэгі). Госці нашай краіны з задавальненнем набываюць на памяць ільняныя абрусы, ручнікі, сурвэткі, адзенне.










**нашай краіны і яе візітоўка. У знак падзякі і шматвяковай вернасці гэтай культуры беларускі народ увекавечыў кветкі лёну ў Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь як сімвал пераўтваральнай моцы працы, знак дабра і дастатку. Шануецца лён і як прыродны сімвал**



# Шчыра дзякую за ўвагу!

